ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 56 (1325) ПАНЯДЗЕЛАК, 9-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90
6 месяцаў	1 р. 80
1 год	3 р. 60

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага № — 2 кап.

II ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ ПЕРАНОСІЦЦА на 13 сакавіка 1931 г.

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЮ:

1. Аб становішчы ўдзелу ЛКСМБ у вясеньняй пасеўнай кампаніі і колектывізацыі (дакл. т. Палякоў).
2. Аб рабочым забесьпячэньні і задачах ЛКСМБ (дакл. т. Гуткін).
3. Аб вайсковай рабоце ЛКСМБ (дакл. т. Гузікаў).
4. Паход комсамола за якасьць і тэхніку. (Юрк'япец).
5. Выбары ЦКК ЛКСМБ.

На пленум выклікаюцца сябры, кандыдаты ЦК і рэвізійнай камісіі, а таксама асобна выкліканыя сэкратары райкомаў.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

ГАВОРЫЦЬ ПРОКУРОР

Прамова дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Крыленка

Суд пераходзіць да спрэчак бакоў. Пры напружанай увазе ўсяе залі дзяржаўны абвінаваўца тав. Крыленка пачынае сваю прамову, аналізуючы гістарычнае і палітычнае значэньне працэсаў, якія адбыліся за апошнія 13 год над рознымі групоўкамі контр-рэволюцыі. Тав. Крыленка кажа, што кожны процэс подводзіць вынікі пройдзенаму этапу, выяўляе, хто беспаваротна асуджаны на гістарычнае паражэньне і хто здолен перарадзіцца і стаць на бок рэволюцыі. Кожны процэс даводзіць, што адбываюцца зьмены ня толькі самой барацьбы, але яе форм і мэтадаў.

Выкрываючы меншавікоў, мы выкрываем іх саюзьнікаў

Цяперашні процэс выявіў новы мэтад клясавай барацьбы—шкодніцтва і стары шпіанаж, простую змову міжнароднай буржуазіі накіраваную на арганізацыю шкодніцкіх актаў. Цяперашні процэс—процэс контр-рэволюцыйнай арганізацыі меньшавікоў, асабліва навучальны. Ён паказвае, што пасьля некаторага перапынку самай жорсткай барацьбы выступілі ў якасьці клясавых ворагаў пролетарыяту ўсе тыя, якія па старой памяці менавалі сябе соцыялістамі. Яны працавалі разам з „промпартыяй"—організацыяй прамысловай буржуазіі, якая імкнецца да няпрыкрытай буржуазнай дыктатуры, да фашыцкага перавароту. Гэта ярка характэрызуе эволюцыю меншавізму за 13 год.

Вызначаючы нашы адносіны да падсудных і тыя меры пакараньня якія пролетарскі суд павінен да іх прыстасаваць, трэба ўлічваць усю небясьпеку іх контр-рэволюцыйнай работы, як актыўных саюзьнікаў тых, якія за граніцай цалкам працавалі на ўзброеную інтэрвэнцыю супроць СССР. У гэтым—яны не адны. З імі ўся ўзброеная імпэрыялістычная буржуазія, уся дробная абывацельская буржуазная маса. На гэтыя элементы меньшавіцкая контр-рэволюцыя і апіраецца.

Выкрываючы контр-рэволюцыйных меньшавікоў, мы разам з тым выкрываем іх саюзьнікаў.

Адказнасьць за контр-рэволюцыйную дзейнасьць меншавікоў падае і на II інтэрнацыянал

Далей тав. Крыленка паведамляе, што Вандэрвэльдэ зьвярнуўся ў ВСНГ СССР з лістом ад імя 2-га Інтэрнацыяналу з прычыны процэсу, у якім ён бярэ пад абарону падсудных. Гэты ліст толькі пацьвярджае, што адказнасьць за злачынныя дзеяньні контр-рэволюцыйнай організацыі меньшавікоў падае і на другі інтэрнацыянал, а вывады якія зробіць пролетарскі суд павінны ў роўнай меры адносіцца і да 2-га Інтэрнацыяналу. У дзеяньнях падсудных тав. Крыленка прадугледжвае:

1) імкненьне да рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне і разам з тым да зьнішчэньня ўсіх заваёў рабочае клясы СССР.

2) Заключэньня палітычнага блёку з контр-рэволюцыйнай „прампартыяй" і атрыманьне ад яе матар'яльных сродкаў для вядзеньня сваёй злачыннай работы.

3) Шкодніцтва ўнутры гаспадарчых органаў, організацыя голаду для рабочых мас.

4) Падрыхтоўка крывавай інтэрвэнцыі, і пасьледуючай страшэннай рэакцыі на дзесяткі год.

5) Здрада інтарэсам пролетарыяту і сусьветнай рэволюцыі. Ня глядзячы на розныя ацэнкі меншавікоў, яны практычна і тэорэтычна падрыхтоўвалі капіталістычную рэстараўцыю.

З гэтым зусім солідарны і дзеячы 2-га Інтэрнацыяналу і заграцічная дэлегацыя меншавікоў і ўся група меншавікоў, якая прадстала перад пролетарскім судом. Такім чынам першы пункт абвінавачваньня тав. Крыленка лічыць зусім даведзеным.

Блёк з „промпартыяй" і „ТКП"


Што датычыць наступнага пункту абвінавачваньня—аб блёку з „прампартыяй" і „ТКП", дык тав. Крыленка ўказвае, што на гэтым пункце суд мае зусім выразныя паказаньні саміх падсудных і сьведак—Рамзіна, Кандрацьева і Някрасава. Паміж меншавіцкай контр-рэволюцыяй і „прампартыяй" была заключана згода. Гэта яшчэ раз пацьвярджае правільнасьць слоў Леніна аб тым што меншавікі—агенты буржуазіі ў рабочым руху, яе прыказчыкі буржуазіі.

У далейшым тав. Крыленка пераходзіць да ацэнкі шкодніцкай дзейнасьці контррэволюцыйнай організацыі меншавікоў. Папярэднія процэсы шкоднікаў і цяперашні процэс—кажа тав. Крыленка—дазваляюць нам констатаваць, што шкодніцтва зарадзілася раней, чым прыняло моцныя організацыйныя формы, якія адпавядаюць контррэволюцыйнай організацыі.

У канцы 1928 году і першай палове 1929 году, калі пачалася сувязь паміж контррэволюцыйнымі організацыямі—меншавікамі, „прампартыяй" і „ТКП", кожная з іх ужо мела што прадставіць у галіне шкодніцтва. Было пастаўлена пытаньне аб размеркаваньні апорных пунктаў гэтых організацый. Для меншавікоў, якія страцілі ўсякі крэдыт сярод рабочых мас, шкодніцтва ў сілу об'ектыўнай немінучасьці зьявілася асноўным практычным мэтодам работы. Сам Кандрацьеў, дапытаны тут, павінен быў прызнацца, што асноўная стаўка яго партыі была на кулацкія колы, якія аказваюць шалёнае супраціўленьне соцыялістычнаму будаўніцтву. Асноўная маса сялянства таксама была па-за межамі дасягальнасьці контррэволюцыянэраў.

Шо-ж заставалася меншавікам апрача стаўкі на дробную інтэлігенцыю, якая магла выкарыстаць сваё становішча ў савецкім апараце, ужываючы мэтод шкодніцтва ў сваёй рабоце, апрача разьлікаў на інтэрвэнцыю?—Нічога. Тая-ж дэзорганізаторская работа магла прывесьці да пастаўленых імі контррэволюцыйных мэт. Усе дзеяньні падсудных яўна былі разьлічаны на тое, каб стварыць хаос і выклікаць нездавальненьне шырокіх рабочых мас супроць савецкай улады. Уся іх работа ні што іншае, як спэкуляцыя на голад і на зрыў мерапрыемстваў савецкай улады.

Разам з гэтым неабвяргальным фактам, становіцца зусім яснай сапраўдная каштоўнасьць дакумантаў, якія характарызуюць позыцыю замежнай меншавіцкай дэлегацыі.—Ніколі ніякіх адносін да шкодніцтва меншавіцкая організацыя ня мела—заяўляюць у сваіх артыкулах Дан, Абрамовіч і інш. іх паплечнікі, злоўленыя на гарачым учынку. Але з іх артыкулаў у „Социалистическом Вестнике" і інш. соцыял-фашысцкіх



Член Вярхоўнага суда-рабачы „Дынамо" т. Пранішнікаў за работай на заводзе.

газэтах тав. Крыленка прыводзіць асобныя месцы, якія бясспрэчна выяўляюць сапраўдную контррэволюцыйную ролю меншавіцкіх двурушнікаў, якія на словах выказваюцца супроць інтэрвэнцыі і шкодніцтва, а на справе дапамагаюць імпэрыялістым у падрыхтоўцы зьвяржэньня савецкай улады.

І ў гэтым паходзе супроць першай у сьвеце рабочай дзяржавы расійскім меншавікам актыўна дапамагаюць таксама і іх сутаварышы з II інтэрнацыяналу—Каўцкі, Вандэрвэльдэ, Блюм і інш.

Тав. Крыленка кажа далей, што ў асноўны плян „Саюзнага бюро" ўваходзіла падрываць народную гаспадарку шляхам шкодніцкага пляваваньня, растроіць грашовы і таварны зварот, дэзорганізаваць рабочае забясьпечаньне і, нарэшце, падрыхтаваць крызіс народнае гаспадаркі СССР з мэтаю падрыхтоўкі і садзейнасьці інтэрвэнцыі. Сваю работу яны праводзілі пры дапамозе расійскіх і замежных капіталістых у цесным контакце з „прампартыяй" і кулацкай контр-рэволюцыйнай групай Кандрацьева, Чаянава і інш. Гэту работа яны праводзілі з дазволу і пры прыхільным удзеле замежнай дэлегацыі меншавікоў і II Інтэрнацыяналу пад прыкрыцьцём соцыялістычных лёзунгаў. Адсюль,—гаворыць Крыленка,—зьнікае ўвесь цяжар палітычнай і галоўнай адказнасьці, якая падае на падсудных. Лягер адкрытай контр-рэволюцыі—вось куды прышлі меншавікі.

Мы вядзем наступленьне па ўсім соцыялістычным фронце. Супроць нас концэнтруюцца ўсе сілы інтэрвэнцыі. Пытаньне аб інтэрвэнцыі з парадку дня буржуазіі і II інтэрнацыяналу ня зьнята. Абвінавачаныя ўзгаднялі сваю дзейнасьць з усімі буржуазнымі контррэволюцыйнымі групамі, складаючы з імі дагавары, прымаючы грашовую дапамогу і ставячы сябе ў залежнасьць ад усіх імпэрыялістычных колаў, якія кіравалі дзейнасьцю буржуазных контр-рэволюцыйных організацый, „прампартыяй" і інш. Іменна на інтэрвэнцыю была ўся іх стаўка і на надрыхтоўку яе была разгорнута шкодніцкая работа. З гэтага становішча трэба выходзіць у вызначэньні меры пакараньня і самаабароны ў адносінах да абвінавачаных.

Дзяржаўны абвінаваўца патрабуе

Тав. Крыленка пераходзіць да індывідуальных характарыстык падсудных.

Громан—аўтарытэт, організатар. Ён сваім аўторытэтам прыкрываў шкодніцкую работу і ёю кіраваў. Другой рэпрэсіі ў адносінах да Громана, як вышэйшай меры соцыяльнай абароны, дзяржаўнае абвінавачваньне ня можа патрабаваць.

Шэр і Якубовіч. Па ролі ў організацыі і ўдзельнай вазе зьяўляюцца права-левай рукой Громана. У адносінах да іх павінна быць ужыта тая-ж мера соцыяльнай абароны, што і да Громана.

Гінзбург—праводзіў кіруючую шкодніцкую работу ў плянаваньні прамысловасьці, знаходзячыся як і першыя тры, у кіруючай пяцёрцы „Саюзнага бюро". Тав. Крыленка прапануе ўжыць да яго вышэйшую меру соцыяльнай абароны.

Суханаў—„прарок у контр-рэволюцыйнай бацькаўшчыне", тып Хлестакова ў політыцы і авантурыстага на практыцы,—так характарызуе яго тав. Крыленка. На ўсім працягу судовага сьледзтва паказваў сябе толькі як тэорэтыка і літаратара меншавіка. Аднак, паказаньнямі другіх падсудных устаноўлен яго практычны ўдзел у рабоце „Саюзнага бюро" у якасьці члена кіруючай пацёркі. Тав. Крыленка патрабуе ўжыць да яго вышэйшую меру соцыяльнай абароны.

Залкінд—у адносінах да яго дзяржаўнае абвінавачваньне патрабуе доўгатэрміновай максымальна-працяжнай ізоляцыі.

Сакалоўскі—у адносінах да яго тав. Крыленка прапануе выбраць тую-ж меру соцыяльнай абароны, што і да Залкінда.

У адносінах да Пятуніна і Бэрлацкага, як актыўных кіраўнікоў контррэволюцыйнай і шкодніцкай работы ў Дзяржбанку і ў Цэнтрасаюзе, тав. Крыленка прапануе ўжыць ізоляцыю на максымальна-доўгі час.

Тэйтэльбаум, Фін-Енатаеўскі і Воўкаў—іх, па думцы тав. Крыленка, неабходна ізоляваць, але на максымальным тэрміне дзяржаўнае абвінавачаньне не настойвае.



Вярхоўны прокурор рэспублікі—т. Крыленка.

Ікаў і Рубін. Гаворачы аб Рубіне, тав. Крыленка выказвае сумненьне ў ягораскаяньні і называе яго політычным хамэлеонам, які многа раз зможа перафарбавацца і прынесьці шкоду. Дзяржаўнае абвінавачваньне ня верыць у разброеньні Ікава. Да іх абодвых пракурор патрабуе ўжыцьця максымальна-доўгай ізоляцыі.

„Няхай II-гі Інтэрнацыянал і замежная дэлегацыя—заканчвае сваю прамову тав. Крыленка,—зноў льлюць кракадзілавы сьлёзы з поваду суровага прыгавару пролетарскага суда. Але мы павінны рабіць сваю справу і абараняць апору сусьветнай рэволюцыі—Саюз ССР. Праўдзівыя словы прыгавару пройдуць праз усе рагаткі хлусьні і паклёпаў капіталістычных краін і прыслужнікаў буржуазіі з II-га інтэрнацыяналу і прасякнуць у сэрца мільёнаў працоўных". Яго апошнія словы пакрываюцца громам воплескаў. Абвяшчаецца перапынак да 10 гадзін раніцы 7-га сакавіка.

У АДКАЗ ІНТЭРВЭНТАМ

ідуць ударнікі заводаў, фабрык і палёў у чырвонаштандарны комсамол

За лепшую пастаноўку працы ў колгасах

У адказ меншавікам Вачышчынская ячэйка Ельскага раёну склала ўмову соцыялістычнае спаборніцтва з Аўруцкай ячэйкай па разгортваньню работы ў колгасах, па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

На гэтым-жа сходзе ў шэрагі ячэйкі прынята 11 чал. у комсамол з актывістых колгасьнікаў і беднякоў.

М. Дзянісаў.

Вытворчымі манэўрамі адказваем на контр-рэволюцыйныя манэўры шкоднікаў

Агульны сход комсамольскай ячэйкі пабудовы Дому Ураду ў адказ на контррэволюцыйную дзейнасьць шкоднікаў абвясьціў па двух пабудовах вытворчыя манэўры з тым, каб пабудову дому ДПУ і дому ураду скончыць да вызначанага тэрміну.

Ячэйка распачала збор сродкаў на пабудову зьвяна самалёту імя Беларускага комсамолу.

Р

* * *

На сходзе Жыткавіцкай ячэйкі ЛКСМБ дзе абгаварвалася пытаньне аб контррэволюцыйнай організацыі меншавікоў 10 батракаў з суседняга колгасу ўступілі ў комсамол. Яны заявілі: ўступіўшы у комсамол, мы будзем яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у нашым будаўніцтве.

80 чырвонаармейцаў у комсамол

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць меншавікоў, комсамольская ячэйка пагранатраду ОДПУ абвяшчае сябе ўдарным вартавым савецкіх межаў.

Пагранатрад пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі і пры актыўным ўдзеле комсамольцаў правёў вялікую працу па ўзмацненьню абароназдольнасьці атраду, па падвышэньню баявой падрыхтоўкі байцоў.

У адной з прымежных вёсках атрадам організаваны колгас „Пагранічнік", у якім працавала 23 комсамольскіх і чырвонаармейскіх брыгады па тры-чатыры дні кожная. Комсамольская ячэйка атраду, як лепшая баявая частка яго, карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод усіх байцоў і насельніцтва.

80 чырвонаармейцаў атраду ў адказ на контр-рэволюцыйную дзейнасьць уступаюць у комсамол.

Атрад будзе цьвёрда стаяць на варце савецкіх межаў—ударным вартавым.

ПРОТЭСТ ДЭПУТАТА КОМСАМОЛЬЦА БЕККЕРА СУПРОЦЬ ПЛЯНАЎ БУРЖУАЗІІ

„Калі-б нямецкая моладзь мела ў руках зброю, дык праз гадзіну быў-бы пакладзен канец вашаму панаваньню"

БЭРЛІН, 7. У пленарным паседжаньні рэйхстагу выступіў дэпутат комсамолец Беккер, спатканы кпінамі буржуазных дэпутатаў. Аднак, гарачая прамова комсамольца адразу-ж прымусіла сьціхнуць залю. Тав. Бекер протэставаў супроць пляну нямецкай буржуазіі павысіць выбарчы цэнз, супроць ставіць яму ў прыклад Савецкага Саюзу, дзе выбарчымі правамі карыстаецца ўсякі працоўны, дасягнуўшы 18-гадовага ўзросту.

„Калі ў Савецкім саюзе выступае правадыр компартыі тав. Сталін,—заявіў Беккер,—працоўная моладзь наладжвае яму авацыі, бо яна ведае, што пад кіраўніцтвам Сталіна ажыцьцяўляюцца пляны будаўніцтва на гаспадарчым і культурным франтох. У Нямеччыне-ж Брунінга закідваюць гнілымі яйцамі. Калі-б нямецкая моладзь мела ў руках зброю, дык праз гадзіну быў-бы пакладзен канец вашаму панаваньню".

НАРКОМЗЕМ РЫХТУЕ ЖЫВЕЛЕ ГАЛОДНЫ ПАЕК

Плян пашырэньня пасеўплошчы кармовых траў і сіласаваньня ня складзены, загатоўка насеньня сарвана

Карэнным чынам пераглядзець орыентыровачныя наметкі аб пасевах тэхтраў і сілосным будаўніцтве

Да суровай адказнасьці

за зрыў пасеўкампаніі кармовых культур

Згодна кантрольных лічбаў разьвіцьця жывёлагадоўлі БССР, на 1931 год гурт буйнай рагатай жывёлы запроектавана давесьці да 2.225.000 галоў, а сьвінны гурт да —2.925.000.

Адпаведна з гэтым плошча пасеву кармовых культур павінна быць сёлета давезена да 35 тысяч га. (З 2 з пал. тысяч мінулага году).

Як-жа НКЗБ і пасеўбюро змагаюцца за ажыцьцяўленьне гэтай лічбы?

Па-першае,—стаўка на самацёк, па-другое, няма кантролю і кіраўніцтва працай на мясцох, плян пашырэньня пасеўплошчы знаходзіцца толькі ў стадыі... канчатковай распрацоўкі. Ніякай сувязі з раённымі пасеўбюро і НКЗБ ня трымаюць, і ня дзіва, што ў іх няма вестак ці будзе сёлета забясьпечана пашырэньне пасеў плошчы пад кармовыя культуры, адпаведна з патрабаваньнямі жывёлагадоўчай і сьвіной гаспадаркі. Па віне НКЗБ і пасеўбюро пляны загатоўкі насеньня сарваны.

На 1-е сакавіка, паводле пляназаданьня, трэ' было загатовіць: канюшыны 10.600 цэнтнэраў, выканана 5,8 проц., цімафеікі—855 цэнтнэраў, ёсьць 10,9 проц., віку—85.240 цэнт. выканана 14,5 проц., сарадэлі—11790 цэнтн., ёсьць 33 проц., лубіну—64.300 цэнтн., ёсьць 2,6 проц.

І ня гледзячы на такое пагражаючае становішча як у справе пашырэньня пасеў плошчы, так і загатоўкі насеньня, чыноўнікі з пасеўбюро ня турбуюцца. Тарасевіч, адзін з кіруючых працаўнікоў пасеў-бюро, так адказвае брыгадзіру на пытаньні:

— Ці будзе забясьпечана сёлета кармовая база—невядома. Якая плошча вызначана самімі раёнамі?—Не вядзецца ўчоту.—Кантрольная лічба пасеўплошчы пад тэхнічнымі і сілоснымі культурамі?—Распрацоўваем... пераглядаем.

З паданага зусім відавочна, што як пасеўбюро, так і НКЗБ безадказна адносяцца да вырашэньня важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства—кар-мовай базы для жывёлагадоўлі і паставілі пад пагрозу пасьпяховае вырашэньне жывёлагадоўчай проблемы.

Гэты абураючы факт нельга інакш расцэньваць як права-опортуністычную практыку ў працы НКЗБ і пасеўбюро, якая накіравана на зрыў пасьпяховага вырашэньня дырэктывы партыі і ўраду аб вырашэньні жывёлагадоўчай проблемы.

Органы РСІ павінны ўжыць тэрміновыя захады з тым каб выправіць опортуністычны прарыў прыцягнуўшы да суровай адказнасьці кіраўнікоў адпаведных сэктараў НКЗБ і пасеўбюро за зрыў працы па сваечасовай распрацоўцы плянаў і давядзеньню іх да раёнаў колгасаў, вёскі, а таксама за зрыў загатовак насеннага фонду, тэхнічных і сілосных культур.

В. Сідарчук.

ВОПЫТ ІВАНЬСКІХ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Пабудова больш танных сілосных ям і траншэй у сілосную кампанію 1931 году будзе мець рашаючае значэньне, бо будаваць вежы дорага ды ня ўсюды ёсьць магчымасьць дастаць будаўнічы матар'ял для вежаў і кваліфікаванную рабочую сілу. Таму вопыт пабудовы сілосных ям у племгасе „Івань" заслугоўвае вялікай увагі.

Сілосная яма ў саўгасе „Івань" пабудавана ўдарнай комсамольскай брыгадай з 5-ці чалавек. Брыгада працавала без дапамогі з боку будаўнічых організацый. Матар'ял для пабудовы ямы, за выключэньнем цэманту, выкарыстоўвалі мясцовы.


Пабудаваная комсамольскай брыгадай яма зроблена з простага мясцовага матар'ялу і каштавала ўсяго 750 рублёў. Як-жа пабудаваная гэтая яма?

Сьцены ямы брыгада выклала за 5 дзён. На сьцены ўзята такая мешанка бэтону; 7 частак пяску, 6 частак бэтоннай цэглы і частка цэманту. Спачатку мяшалі пясок з цэмантам да вільгаці, пакуль не ўтвараўся камок сьціснутай мешанкі ў кулаку, потым дабаўлялі бэтонную цэглу і пускалі ў кладку.

Для штукатуркі бралі такую мешанку: 4 (аб'ёмныя) часткі сеянага пяску, 1 частку цэманту і 2 часткі вады.

Праца вялася ў наступным парадку: у выкапаную яму на дно ставілі круг з дошак, набітых на два калы, вышынёю ў 70 сантымэтраў. Знадворную частку круга абівалі бляхай, потым ставілі шчыткруг, як бочка ў выкапаную яму (абавязкова па ватэрпасу). Такім чынам, наміж сьценкай круга і сьценкай ямы ствараўся празор. У гэты празор і закладвалі бэтон. Праз кожныя 30 сантымэтраў укладзеней сьцены закладвалі ў калючага дроту абручы, які ўмацавалі ў сьцяне. Такім чынам атрымоўвалася „жэлеза-бэтонная яма".

Калі сьцены даходзілі да вышыні круга (70 сант.) яго перабіралі на 2 часткі і зноў устанаўлівалі па ватэрпасу.



У жывёлагадоўчым колгасе

Ёмістасьць гэтай ямы-каля 160 кубамэтраў. Над ямай пастаўлена на слупох павець з саламяным дахам. На двух слупох ляжыць перакладзіна, каб можна было даставаць сілос з ямы вяроўкай, або блёкам.

Такую яму магчыма пабудаваць без асаблівых цяжкасьцяй, добрую і танную. Сілаж з такіх ям, як даведзена досьледамі, выходзіць ня горш, як з вежаў. Таму комсамол у сваёй барацьбе за сілос павінен змагацца за пабудову ям, якія больш танны, чым вежы, бо не патрабуюць вялікай колькасьці прывознага матар'ялу. Іх можна ў большасьці будаваць з мясцовага матар'ялу. Пабудаваная комсамольскай брыгадай савгасу „Івань" яма—лепшы гэтаму прыклад.

Зоот. Прахневіч

Цыркулярамі жывёлу не накарміць

У прыгарадных гаспадарках Белкоопсаюзу-пагражаючае становішча з кармамі. Шэраг ЦРК, Полацкі, Менскі, Віцебскі,—зусім ня маюць кармоў для жывёлы. Асаблівы недахоп адчуваецца ў грубых кармох.

Белкоопсаюз і ЦРК ня ўжылі ніякіх захадаў, каб забясьпечыць свае гаспадаркі кармамі.

Плошча пад палявыя культуры ў прыгарадных гаспадарках Белкоопсаюзу пашыраецца сёлета да 18 тыс. га, з якіх пад агародныя расьліны —5500 га. Вялікая плошча адводзіцца для пасеву кармовых культур.

Але пляны па пашырэньню пасеўплошчы знаходзяцца пад вялікай пагрозай. Белкоопсаюз ня прыняў ніякіх захадаў падрыхтаваць насеньне, гужавую сілу, каб ажыцьцявіць плян пасеўкампаніі.

Прыгарадныя гаспадаркі не забясьпечаны насеньнем. Так, для сяўбы патрэбна 2317,6 тон бульбы, а ёсьць толькі 507,8 тон. Аўса патрэбна 251,25 тон, ёсьць толькі 88. Для засеву вікі з аўсом патрэбна 474 тон, а маецца толькі 45.

Сілосных культур толькі 2 тоны, замест патрэбных 38,4. Няма зусім сланечніку сэрадэлі і гародных культур.

У галіне забясьпечаньня насеньнем прыгарадных гаспадарак Белкоопсаюз праводзіць права-опортуністычную стаўку на самацёк.

Белкопсаюз ня вызначыў сёлетняй патрэбы ў сілосе, ня гледзячы на тое, што гурт рагатай буйнай жывёлы пашыраецца ў гаспадарках ЦРК да 13.750 галоў. Ёсьць даныя, што толькі 70 процантаў гурту жывёлы будзе сёлета забясьпечана кармамі.

Пашырэньне плошчы пад агародныя і палявыя культуры не прадугледжана побач з пашырэньнем жывёлагадоўлі.

Брыгадзір „Ч.З."—Заслаўскі

НЕ ПАЎТАРЫЦЬ леташніх памылак


Адным з вузлавых пытаньняў у справе разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца стварэньне кармовай базы як асновы жывёлагадоўлі. У кармовым пытаньні магутным сродкам пашырэньня кармовае базы і рухавіком колектывізацыі зьяўляецца —сілос. Сілос захоўвае сакавіты корм для жывёлы пры любых ўмовах на працягу доўгага часу зьяўляючыся трактарам жывёлагадоўлі.

Сілосная кампанія мінулага году па БССР была сарвана. Галоўныя прычыны: позна распачатая падрыхтоўка да сіласаваньня, недавыкананьне плянаў засеву, невыстарчальнае і несваечасовае разьмеркаваньне паміж саўгасамі і колгасамі насеньня, сілосных культур, недахоп кадраў на мясцох, знаёмых з справай сіласаваньня, асабліва прыняўшы пад ўвагу яе навізну, опортуністычная недаацэнка сіласаваньня некаторымі саўгасамі і колгасамі, а таксама грамадзкімі організацыямі, якія не прыцягнулі шырокіх колаў насельніцтва (рабочых саўгасаў, колгасьнікаў, піонэраў, комсамольцаў, школы, настаўніцтва і г, д.)да актыўнага ўдзелу. Усе гэтыя моманты затрымлівалі справу, зьнізілі выкананьне плянавых заданьняў сіласаваньня па БССР да 7,1 проц. па саўгасах —21,3 проц. колгасах—9,4 проц., індыв. сэктары 0,5 проц.

Для выкананьня плянаў сіласаваньня 1931 году неабходна заразжа, улічыўшы недахопы мінулага году, ва ўсю шырыню паставіць у парадак дня наступныя задачы:

Давесьці пасеўныя плошчы сіласаваньня да саўгасаў, колгасаў і аднаасобнае гаспадаркі. Забясьпечыць гэтыя плошчы насенным матар'ялам, вызначыць пункты пабудовы сілосных установак, сваячасова надрыхтаваць мясцовы матар'ял для сілоснага будаўніцтва,

Толькі пры сваечасовым выка-



наньні паказаных задач. Надаўшы працы ўдарныя тэмпы шляхам социялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мобілізаваўшы к рабоце дасьледчыя станцыі, агропэрсонал земорганаў, саўгасаў і колгасаў, прыцягнуўшы да гэтай работы комсамол, профсаюзы, друк—даўшы руйнуючы ўдар па опортуністычнай недаацэнцы сілосу магчыма забясьпечыць выкананьне плянавых заданьняў сіласаваньня 1931 году.

Комсамол і на фронце барацьбы за сілос павінен паказаць прыклад бальшавіцкага вырашэньня задач соцыялістычнай рэконструкцыі жывёлагадоўлі, шляхам організацыі скразных брыгад,

Масавае правядзеньне сілоснай кампаніі 1931 году пачынаецца з якаснага дасьледваньня сілоснай кампаніі 1930 г., якое робіць інстытут кармоў Усесаюзнай Акадэміі с/г навук. Комсамол павінен скарыстаць гэтыя досьледы для сілоснай кампаніі 1931 году.

А. Даніловіч.

Шляхі вырашэньня кармовай проблемы ў сьвінасаўгасах і колгсах

Побач з хуткімі тэмпамі разьвіцьця жывёлагадоўлі павінна ня менш хуткім тэмпам пашырацца плошча і павялічвацца ўраджайнасьць кармавых расьлін. У сёлетнюю вясну мы павінны забясьпечыць нашыя сьвінагадоўчыя гаспадаркі пашай, сакавітым зялёным кормам і сенам.

Організацыя пашы ў сьвінагадоўчых гаспадарках павінна стаць агульным правілам. З найбольш пажаданых зьяўляецца шматгадовая люцэрнавая, канюшынная пашы і мешанкі хлебных траў з матыльковымі, а з сілосных расьлін найбольш пажаданымі і ўраджайнымі, па досьледах Тураўскай станцыі, зьяўляецца кукуруза, сарго і магар.

Гэтыя культуры даюць найбольшую ўраджайнасьць на поўдні і паўночна-ўсходняй частцы БССР.

Але кульуры для пашы і сілосу, якія прыведзены вышэй, патрабуюць добра угноенай глебы. Ня менш угноенай глебы патрабуюць і караньплоды. Таму нам патрэбна шукаць такія расьліны, якія як мага больш скарыстоўваюць багацьце самай глебы, а значыцца менш патрабуюць угнаеньня.

К такім культурам ва ўмовах БССР адносіцца грэчка, лубін, сэрадэля, зімова-жытня-вікавая мешанка, падсеўны лубін, падсеўная сэрадэля, пялушка з аўсом, альбо з грэчкай і, на некалькі больш запраўленых глебах, пасеўная морква, пажыўны турнэпс, пажыўная бручка, высаджаная фляцсамі бульба, канюшына чырвоная, адна і ў мешанцы з белай канюшынай.

Першыя пяць культур, якія пералічаны, здавальняюча разьвіваюцца на мала ўгноеных і пясчаных глебах, другія пяць культур патрабуюць некалькі запраўленай глебы.

Гэтыя культуры і павінны ў першы час, да поўнага забясьпечаньня палёў угнаеньнем, вырашаць кармовае пытаньне ў сьвінаводчых колгасах і саўгасах.

Побач з гэтымі культурамі, на больш угноеных падсядзібных палёх, належыць закладваць штучныя люцэрнавыя пашы з мешанкай траў жытніх і матыльковых, а таксама часткова ўводзіць караньплоды, кукурузу і сою ў мешанцы з пялюшкай.

Некаторыя зямельныя аддзелы ў мінулым годзе ў сваіх пасеўных плянах рэзка скарацілі такія культуры як сланечнік, кукуруза, а таксама і караньплоды. якраз рабілі гэта раёны з пясчанымі глебамі, як, напр., былая Бабруйская акруга, дзе гэтыя культуры найбольш добра разьвіваюцца. У выніку завезенае туды насеньне кукурузы і сланечніка ня было выкарыстана. Ніякай увагі не зьвярталася на грэчку, як на кармавую расьліну ў зялёным і сілосным выглядзе, а грэчка ў саўгасах і колгас павінна адыграць вялікую ролю. Яна, па нашых досьледах, разьвіваецца на тых глебах, дзе адмаўляецца расьці канюшына, віка, яравыя і іншыя культуры і дае ўраджай на 30 цэнтнэраў сухой саломы. Гэта значыць—ураджай, роўны ўраджаю віка-аўсянай мешанкі, якая сеецца на ўгноеным папары.

У нашых досьледах на Тураўскай сельска-гаспадарчай станцыі грэчка давала лепшую масу пасьля засеву яе паміж 20 чэрвеня і 10 ліпеня. Мы атрымалі рэкордную ўраджайную масу з адзінкі плошчы, занятай зімовой вікай і пасьля яе пажыўнай грэчкай, пры двухкратным выкарыстаньні плошчы. Грэчку на сілос трэба ўбіраць зараз-жа пасьля цьвіценьня, калі яна дае найвышэйшую масу.

Акрамя гэтых культур досьледамі даведзена магчымасьць скарыстаць на корм сілосны лубін. Па досьледах, выхаваньне парасят на вызначаным насеньні лубіну ішло з такім-жа посьпехам, як і на жмыхах і аўсяной муцэ. Таму лубін, як кармовая расьліна, павінен заняць адно з першых месц. Акрамя таго, што лубін не зьяўляецца вымагальным да апрацоўкі і ўгнаеньня глебы, дае высокую ўраджайную масу (у нашых досьледах да 90 цэнтн. з га), дае багаты бялковы пажыўны матар'ял.

Яшчэ больш ураджайную масу мы атрымалі пры засеве мешанкі лубіну з грэчкай (1 ц.+1 ц.=мешанка насеньня). Падсеўны лубін у міжрадзьдзі зімовага жыта, у пэрыод выхаду яго ў трубку, ва ўмовах паўднёвай часткі БССР пасьпяхова можа пры позьняй і добрай восені дасьпець і даць ураджай.

Такім чынам, па першых парах у буйных сьвінагадоўчых гаспадарках, у якіх ня хапае ўгнаеньня для глебы-кармовае пытаньне павінна вырашыцца за рахунак разьвіцьця культур, якія мала патрабуюць угнаеньня.

М. Драздоў.

Аўладаючы тэхнікай—гэта значыць—нас не самнуць

У адказ на контр-рэволюцыйную дзейнасьць меншавікоў-інтэрвентаў расьце масавы рух рабочай моладзі за аўладаньне навукай і тэхнікай, за тэмпы плюс якасьць

Гэты паход павінен быць ператвораны ў паход за зьніжэньне сабекошту, паляпшэньня якасьці продукцыі, у паход за выкананьне і перавыкананьне пляноў, трэцяга рашаючага году 5-годкі

Сёньня комсамолія Барысаву рапартуе плянам конкрэтных спраў

Энтузіязм памножым на тэхніку

…рачысты вечар, організаваны РК ЛКСМБ, брыгадай ЛКСМБ „Чырвонай Зьменай“, РК КП(б)Б і „Бальшавіком“ Барысаўшчыны, прысьвечаны паходу комсамолу за аўладаньне тэхнікай, прайшоў пад лёзунгам выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ …лізацыі прамовы тав. Сталіна. Гэты вечар быў вечарам распрацоўкі плянаў конкрэтных спраў з тым, каб, як сказаў тав. Сталін, „вывучыць тэхніку, аўладаць ёю, а калі гэта зробім, тады ў нас пойдуць тэмпы, аб якіх мы зараз і марыць ня можам“.

…гэтым вечары буйнейшыя вытворчыя колектывы ЛКСМБ рапартавалі аб праведзеных імі конкрэтных мерапрыемствах і абавязках, …ых па далейшаму разгортваньню барацьбы за тэхніку.

…варылі людзі—бальшавікі, гаварылі заводы і фабрыкі.

Організаваць 12 тэхнічных гурткоў па цэхах і 3 агульна-фабрычныя, стварыць ударныя брыгады ў заклік у тэхніку—узялася фабрыка „Чырвоная Бярэзіна“. Комсамольцы ўзялі шэфства над …ымі прапановамі. Яны абавязаліся організаваць пляніва-опэрацыйныя групы па цэхах. Дэкаду …му якасьці пратварыць у скразны соцыялістычны конвэер якасьці. Організаваць тэхнічныя гурткі па цэхах і тэхнічны габінэт у …е.

…я ажыцьцяўленьня шэфства над электрыфікацыяй, цэнтральная электрастанцыя імя Леніна зьвярнулася з шэрагам конкрэтных прапаноў. Сярод іх асаблівае ўвагі заслугоўвае прапанова ўзяць шэфства над тарпянымі масывамі. Узмацніць работу гурткоў электрамантэраў, машыністых і качагараў. …пнуць туды жанчын. Праверыць выткаваньне электроэнэргіі па гарадзкой сетцы і ўсімі спажыўцамі ЦЭ…

…овы, жывы струмень уліць у …асу профтэхкурсаў, организаваць …гурткоў па вывучэньню тэхнікі… …ся колектыў заводу „Домбаль“.

Для павышэньня тэхнічных ведаў адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал організоўвае спэцыяльныя гурткі. „Домбальцы“ ўзяліся вывучыць плян рацыяналізацыі па заводу і паасобных цэхах на 1931 год. У соц. дагавор паміж ударнымі брыгадамі і цэхамі ўнесены пункты аб абавязковай тэхнічнай адукацыі. Організаваць тэхнічны габінэт.

Рапартаваў сваімі конкрэтнымі мерапрыемствамі ў гэтай галіне „Комбінат“.

У складзенай умове паміж бюро райкому ЛКСМБ і раймбітам комсамолу узяў на сябе абавязкі давесьці ідэю аўладаньня тэхнікай да кожнага комсамольца.

Сіламі РК у 5-ці цэхавых ячэйках і 3-х саўгасных організоўваецца паказальная работа па аўладаньню тэхнікай. Сіламі „лёгкай кавалерыі“ правяраецца выкананьне рабочых прапаноў.

Увесьці ў політсетку абавязковую гадзіну тэхнічнага навучаньня, разгарнуць выпіску тэхнічнай літаратуры.

РайМБІТ абавязаўся організаваць пры фабрыках „Профінтэрн“, „Комінтэр“, Леніна, чыгунцы „Чырвонай Бярэзіне“ і г. д. гурткі-курсы па вывучэньню варштатаў, машын земляробства і інш.

Організаваць гурткі вынаходцаў. Пры клюбах ствараюцца вытворча-тэхнічныя выстаўкі, куткі, габінэты па тэхніцы і энэргетыцы.

Сэкцыя ІТР абавязалася ўсямерна дапамагаць аўладаньню тэхнікай у навуковых установах, шляхам паказаньня пастаноўкі працы па політэхнізацыі школ на прадпрыемстве і ва ўстанове, вылучаючы для гэтага адпаведных кіраўнікоў.

Гэта быў вечар спайкі комсамольскага задору з інжынэрна-тэхнічнымі ведамі, для далейшага штурму прарываў, для сумеснай працы і барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Куюцца кадры

З 1-га студзеня 1930 году па сёньнешні дзень тэхнічны пэрсонал ЦЭС падрыхтаваў з чорнарабочых двух дзяжурных ля шчыта, 10 электраманцёраў. 13 электраманцёраў вышэйшай кваліфікацыі, 8 машыністых турбін, 19 машыністых насосаў, 20 сьлесароў па рамонту монтажу ЦЭС.

Перакваліфікавана для догляду за катламі высокага ціску 20 чалавек, 8 чорнарабочых падрыхтаваны ў качагары. Усё гэта сьведчыць аб тым, што інжынэрна-тэхнічныя сілы ўвесь час змагаліся за падрыхтоўку кадраў. Але гэта, бязумоўна, недастаткова. Надалей неабходна яшчэ больш фарсаваць падрыхтоўку кадраў, выпускаючы людзей сапраўды падкаваных, з багатымі ведамі. На сёньнешні дзень організаваны тры гурткі электраманцёраў, машыністых і качагараў. Работа гурткоў праходзіць пры актыўным удзеле ўсёй комсамольскай ячэйкі.



ШЛЯХі БАЛЬШАВІЦКАГА НАСТУПУ

Дагавор Барысаўскага РК ЛКСМБ з ІТС

Барысаўская організацыя ЛКСМБ, складаючы ўмову з ІТС, узяла на сябе шэраг конкрэтных абавязкаў, якія павінны забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольскай організацыі ў барацьбе за тэхніку і аўладаньне ёю з тым, каб пры сумеснай працы з інжынэрна-тэхнічнымі сіламі і ўсёй грамадзасьцю аўладаць цы адзельлю тэхнікі.

Комсамолія абавязалася.

Давесьці ідэю аўладаньня тэхнікай да кожнага комсамольца шляхам правядзеньня гутарак, дакладаў на сходах, спэцыяльных вечароў тэхнікі і г. д.

Апорным пунктам барацьбы за соцыялістычную тэхніку павінна стаць ударная брыгада. Усе ячэйкі комсамолу павінны правесьці масавую праверку абавязкаў ударных брыгад, уключаючы ў іх паказчыкі барацьбу за аладаньне тэхнікай.

Увесьці ў політсетку абавязковую гадзіну вывучэньне тэхнікі.

10 сакавіка разам з рэдакцыяй газэты „Бальшавік Барысаўшчыны“, правесьці раённую праверку-пераклічку па выкананьню адозвы ЦК УсеЛКСМ і гэтага дагавору.

Правесьці вечар-урачыстае паседжаньне рабочых-спэцыялістых—па пытаньню аб аўладаньні комсамолам тэхнікай, на якім прыняць шэфства над электрофікацыяй.

Дамагчыся выпіскі не менш 1000 экз. тэхнічнай літаратуры. „Нашы дасягненьні“, „Навука і тэхніка“, „Тэхніка масам“, „Журнал рационализации“, а таксама тэхнічнай літаратуры па асобных пытаньнях.

На падставе разгортваньня соц. спаборніцтва і ўдарніцтва разгарнуць шырокую масавую працу па складаньню соц. умоў паміж комсамольцамі, ячэйкамі, інжынэрамі і тэхнікамі паасобных прадпрыемстваў.

Дабіцца організацыі плянава-опэрацыйных груп пры ўсіх ячэйках ЛКСМБ, якія павінны змагацца за аўладаньне пляніваньнем, зьніжэньне сабекошту і г. д.

ІТР абавязваецца:

Організаваць пры фабрыках „Профінтэрн“, „Комінтэрн“, ГЭС імя Леніна, „Бярэзіна“, „Рабочы“, „Домбаль“, Комбінат, „Леспрамгас“, сувязі, „Маяк Соцыялізму“, Вясёлага, Паліцюм, Сяржпунага, гурткі—курсы па вывучэньню варштатаў, машын, тэхнікі земляробства і г. д., забясьпечыўшы іх адпаведнымі кіраўнікамі і перабудоўваючы гэтыя гурткі на больш масавыя рэйкі.

ІТС абавязваецца організаваць гурткі вынаходзтва на „Комінтэрне“, „Домбалі“, „Бярэзіне“, чыгунцы і „Комбінаце“, усімі сіламі дапамагаючы рабочаму вынаходзтву, прыцягваючы ў гэтыя гурткі для вывучэньня і правядзеньня ў жыцьцё рабочых вынаходзтваў.

ІТС бярэ на сябе організацыю на заводах і пры клюбах вытворчых і тэхнічных выставак, куткоў і габінэтаў па тэхніцы і электрофікацыі; на „Комінтэрне“, „Комбінаце“, „Маяк Соцыялізму“, у хэмікаў і чыгуначнікаў, організуючы вакол гэтых гурткоў рабочы актыў, популярызуючы сярод рабочых тэхнічныя веды.

ІТС абавязваецца організаваць пры прадпрыемствах „Комінтэрн“ „Домбаль“, „Бярэзіна“, „Рабочы“, „Дом Колгасьніка“ НТА, прыцягваючы ў іх шырокія рабочыя масы.

РайМБІТ абавязваецца правесьці ў раённым маштабе рад лекцый на папулярна тэхнічныя тэмы, прыцягваючы навуковых прапаўнікоў.

Адначасова з гэтым, організаваць гурткі па вывучэньню замежных моў для інжэнэра-тэхнічных работнікаў і рабочых Барысава, пры клюбе хэмікаў і „Комінтэрн“.

Комсамольскія організацыі павінны садзейнічаць правядзеньню вышэй азначаных мерапрыемстваў, абвясьціўшы паміж цэхам соцспаборніцтва на лепшае аўладаньне тэхнікай,

Сэкцыя ІТС абавязваецца ўсямерна дапамагаць аўладаньню тэхнікай у навуковых установах шляхам паказальнай па становкі працы па політэхнізацыі школ, вылучаючы для гэтага лепшых кіраўнікоў.

Толькі пры актыўным удзеле ўсіх інжынэрна-тэхнічных сіл, сумесна з комсамольцамі, задачы па аўладаньню тэхнікай будуць выкананы.

Дагавор падпісаны прадстаўнікамі РК ЛКСМБ ІТС.



Вывучаем тэхніку пляніваньня

У сувязі з узяцьцем шэфства комсамолу над электрыфікацыяй і абвяшчэньнем паходу за тэхніку, агульны сход ІТС, разам з комсамольскай ячэйкай, прыступіў да конкрэтнага выкананьня пастаўленых перад комсамолам задач. **Т. і К.**

Кожная брыгада, з дапамогай інжынэрна-тэхнічных работнікаў, павінна скласьці для кожнага брыгадзіра мінімум тэхнічных ведаў, выходзячы з умоў яго працы.

Усе цэхавыя ячэйкі павінны ўключыць як асноўнае зьвяно, выкананьне конкрэтных абавязкаў па паасобных рацыяналізатарскіх мерапрыемствах, павышаючы вытворчыя магчымасьці цэху, саўгасу і колгасу, паляпшаючы тэхнічную вучобу па падставе гэтых абавязацельстваў.

Сіламі РК ЛКСМБ у пяці цэхавых (Бярэзіна, „Комінтэрн“, „Домбаль“, і „Комбінат“) і трох саўгасных і колгасных ячэйках (Весялова, організаваць паказальную працу па аўладаньню тэхнікум. з боку бюро РК забясьпечыць сыстэматычнае кіраўніцтва і контроль у працы ячэяк.

Выслаць 20 брыгадзіраў на дапамогу ячэйкам раёну ў працы па наладжваньню паходу за тэхніку.

Усім „лёгкім кавалерыстам“ раёну правесьці баявую праверку рэалізацыі рабочых прапаноў, аднячасова разгортваючы работу па збору іх.

Дапамагчы ІТС у організацыі пры клюбах „Комінтэрн, Хэмікаў, Комбінату і чугункі габінэтаў тэхнікі і рацыяналізацыі, якія павінны аб'яднаць комсамольскі актыў і інжынэрна-тэхнічныя сілы для сумеснай работы і кіраўніцтва комсамольскімі гурткамі па паходу за тэхніку і электрофікацыю.

Тэмпы плюс якасьць

…сваім дакладзе аб выніках IX зьезду УсеЛКСМ, на сходзе ленінградзкага актыву, тав. Косараў сказаў: „Нам мала ўдарніка, нам патрэбен ударнік-плянавік, ударнік-рацыяналізатар, ударнік-тэхнік.

Комсамолец павінен быць ударнікам і грамадзкім працоўнікам. Ён павінен умець злучаць высокія тэмпы вытворчай работы, барацьбу за аўладаньне тэхнікай з грамадзкай работай.

…розных вучастках гаспадарчага будаўніцтва паасобныя атрады …у ўпарта павышаюць сваю тэхнічную баяздольнасьць. Іх творчая …ка ў пляніваньні соцыялістычнай вытворчасьці пачынае ісьці ад заводу да Дзяржпляну і ВСНГ, яна пачынае ўтвараць рэволюцыю ў …іцы.

Комсамольцы Кузьнецкага будаўніцтва выключна сваімі сіламі будуюць і абсталёўваюць буйнейшы Кузьнецкага комбінату. Прапанова комсамольцаў заводу імя Дзяржынскага на Украіне аб сухім гашэньні коксу і аб сталасьці шахты …і вядомымі ўсёй краіне. Праз організацыю дыспутаў комсамольцы Харкаўскага ГЭС— адчыняюць у тэхніцы эру тэхнічнай самакрытыкі.

Да вялікіх тэмпаў, якімі мы ідзем, павінна быць дадана барацьба за высокую якасьць. Нам трэба даводзіць прамфінплян да варштата і па колькасных і па якасных паказчыках.

Рацыяналізацыя, вынаходзтва павінны разгортвацца комсамолам на ўзровень аўладаньня новым будаўніцтвам, новымі мэханізмамі, соцыялістычным ужываньнем машын, барацьбой са стратамі, агульная колькасьць якіх у прамысловасьці складае 2 мільярды рублёў.

У гэтай галіне трэба вучыцца ў мурамцаў, якія злучылі ўдарніцтва з японскімі мэтодамі будаўніцтва транспорту і перагналі дзякуючы гэтаму Японію, якая зьяўляецца першай капіталістычнай краінай па хуткасьці і якасьці выпуску паравозаў з рамонту. Кіраўніцтва ячэек і камітэтаў павінна ўзьняцца на ўзровень сучасных задач комсамолу: „наступае такі момант, калі растучай грамадзка-політычнай актыўнасьцю моладзі нельга кіраваць без веданьня спэцыяльных тэхнічных дысцыплін, без веданьняў конкрэтных пытаньняў для нашай прамысловасьці, для нашай вёскі, для ўсёй народнай гаспадаркі (Косараў).

Пры дапамозе ўдарніка і інжынэра нам неабходна аўладаць конкрэтнымі пытаньнямі вытворчасьці і будаўніцтва.

Падрыхтоўка кадраў кваліфікаванай рабочай сілы праз асноўную форму ФЗВ і каротка-тэрміновыя курсы, а таксама ў навукова-дасьледчых установах павінна забясьпечыць нараджэньне сусьветных вучоных з радоў комсамолу.

Узьняўшы соцыялістычнае спаборніцтва на ступень барацьбы за рацыяналізацыю, за пляніваньне, за сустрэчны прамфінплян, на падставе новай тэхнікі мы ў некалькі разоў паскорым тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва і ў найкарацейшыя гістарычныя тэрміны ажыцьцёвім лёзунг: дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-экономічных адносінах.

К.

„Комбінат“ у паходзе за тэхніку

25 лютага г. г. ячэйкамі комсамолу былі скліканы сходы комсамольцаў сумесна з ІТС па ўсіх прадпрыемстваў комбінату, на якіх распрацоўвалі конкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньню тэхнічнай вучобы, там-жа былі выпрацаваны програмы практычных і тэорэтычных заняткаў.

Пры ўсіх заводах арганізаваны гурткі па вывучэньню тэхнікі, якім ахоплена 54 чалавекі. На заводзе „Пролетарскі Молат“ гурткі прыступілі ўжо да заняткаў, **Ком.**

Комсамол—шэф усеагульнага навучаньня

ДАМО 500!

ПАПОУНІМ РАДЫ ЧЫРВОНАШТАНДАРНАГА НАСТАЎНІЦТВА

Усеабуч—баявая задача сёньнешняга дню

БССР мае вялізарныя дасягненьні на фронце ўсеагульнага навучаньня. БССР адной з першых рэспублік увяла ўсеагульнае пачатковае навучаньне. У бягучым нав. годзе ўведзена 1 тысяча 787 новых комплектаў пачатковай школы і 360 груп другога концэнтру. Плянам Наркамасьветы прадугледжана ў 1931 годзе ахапіць пачатковай школай усіх дзяцей ад 8 да 11 год, фабрычна-заводзкімі сямігодкамі і школамі колгаснай моладзі—**усіх дзяцей рабочых і колгасьнікаў.**

Выкананьне гэтых важнейшых мерапрыемстваў па ўсеагульнаму навучаньню ўпіраецца ў недахоп пэдагогічных кадраў. Таму проблема пэдкадраў ставіцца зараз ва ўсю шырыню.

— „На бягучы год,—гаварыў наркамасьветы т. Платун на X усебеларускім зьезьдзе Саветаў,—нам ня хопіць 1200 настаўнікаў. Тут павінен прыйсьці на дапамогу ў першую чаргу комсамол, які павінен даць значную колькасьць комсамольцаў для таго, каб мы змаглі зрабіць іх настаўнікамі праз кароткатэрміновыя курсы“.

Комсамол зьяўляецца шэфам усеагульнага навучаньня. Комсамол мае вялізарны зрухі ў галіне будаўніцтва новай школы, барацьбе за ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня.

Сёньня мы друкуем пастанову сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 500 комсамольцаў на кароткатэрміновыя пэдагогічныя курсы. Своечасовае выкананьне гэтага важнейшага мерапрыемства комсамолам—шэфам ўсеагульнага навучаньня, зьявіцца парукай яшчэ больш хуткага, больш пасьпяховага ажыцьцяўленьня колёсальных задач культурнай рэволюцыі.

Райкомы ЛКСМБ павінны тэрмінова разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол выкананьня гэтага адказьнейшага мерапрыемства павінны забясьпечыць своечасовую мобілізацыю 500 комсамольцаў

Трэба памятаваць, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў па ўсеагульнаму навучаньню **„будзе найвялікшай пэрамогай ня толькі на культурным, але і на політычным і гаспадарчым фронце“ (Сталін).**



Вучні 2 школы сямігодкі на занятках у ліцейным цэху заводу „Комунар“ (Менск)

Мобілізуем 500 комсамольцаў на пэдагогічныя курсы

Пастанова сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 500 комсамольцаў на 6-цімесячныя пэдкурсы пры пэдтэхнікумах БССР

Улічваючы значны недахоп настаўнікаў, асабліва 1931 г., што стварае простую пагрозу своечасоваму правядзеньню ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці перад комсамолам ва ўсю шырыню стаіць пытаньне аб актыўным удзеле ў падрыхтоўцы кадраў настаўнікаў.

Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Мобілізаваць 500 комсамольцаў на працягу 2-х тыдняў на 6-ці месячныя пэдкурсы пры пэдтэхнікумах БССР. На пэдкурсы неабходна мобілізаваць рабочых, дзяцей рабочых, батракоў, беднякоў—колгасьнікаў і сераднякоў—колгасьнікаў. Аддзелу адукацыі і быту сумесна з НКА разьмеркаваць мобілізаваных „500“ па навучальных установах БССР.

2. Прапанаваць РК ЛКСМБ поўнасьцю выканаць мобілізацыю „500“ на пэдкурсы, згодна наступнага разьмеркаваньня:

1) Полацкі пэдтэх.—35 чал.: Асьвея—5, Расона—5, Дрыса—5, Варковічы—4, Полацк—6, Ветрына—5, Вушачы—5 чал.

2) Віцебскі—70 чал.: Мяжа—2, Гарадок—8, Сураж—7, Сіроціна—5, Вулла—4, Віцебск—18, Бешанковічы—5, Лёзна—5, Высачаны—5, Багушэўск—3, Сянно—5, Чашнікі—5 чал.

3) Лепельскі—5 чал.: Лепель—5.

4) Ворша—30 чал.: Ляды—3, Дуброўна—6, Ворша—7, Колысь—5, Горкі—5, Дрыбін—4.

5) Барысаўскі—25 чал.: Чарэя—4, Талочын—5, Крупкі—5, Крупка—4, Барысаў—7.

6) Менскі—100 чал.: Бягомль—5, Халопенічы—5, Плешчаніцы—5, Лагойск—4, Смалявічы—5, Заслаўе—4, Менск—20, Сьмілавічы—5, Чэрвань—5, Бярэзіна 4; Койданава—6, Вузда—5, Пухавічы—5, Сьвіслач—5, Асіпавічы—5, Грэск—5, Капыль—5, Старыя Дарогі—5.

7) Магілеўскі—60 чал.: Бялынічы—5, Магілеў—8, Лупалава—5, Чавусы—4, ст. Быхаў—6, Чэрыкаў—5, Клімавічы—6, Хоцімск—4, Касьцюковічы—5, Краснаполье—5.

8) Мсьціслаў—15 чал.: Мсьціслаў—6, Расна—5, Крычаў—4 чал.

9) Слуцкі—5 чал.: Слуцак—5 чал.

10) Бабруйскі—25 чал.: Клічаў—5, Бабруйск—7, Глуск—5, Любань—5, Старобін—2, Чырвоная Слабада—3.

11) Рагачоўскі—20 чал.: Рагачоў—6, Чачавіцы—5, Прапойск—5, Журавічы—4, Карма—5.

12) Гомельскі—60 чал.: Чачэрск—5 Жлобін—8, Парычы—4, Буда-Кашалёва—5, Уваравічы—6, Ветка—6, Гомель—15, Цярахоўка—4.

13) Рэчыцкі—20 чал.: Рэчыца—6, Лоеў—4, Брагін—5, Камарын—5 чал.

14) Мазырскі—25 чал.: Азарычы—4, Мазыр—5, Петрыкаў—4, Жыткавічы—4, Тураў—5, Камарынскі—3, Нароўля—3.

3. Прымаючы пад увагу, што мобілізацыя „500“ зьяўляецца асабліва важным політычным мерапрыемствам, лічыць мэтазгодным нават зьнімаць комсамольцаў з менш важнай працы для пасылкі на пэдкурсы.

4. Улічваючы асаблівую важнасьць своечасовага і поўнага выкананьня мобілізацыі „500“, вылучыць адказным за яе правядзеньне тав. Рубінчыка. Адказнасьць за мобілізацыю „500“ па райкомах ускласьці пэрсанальна на сэкратароў РК ЛКСМБ.

Прапанаваць упаўнаважаным—сэкратарам РК—па правядзеньню мобілізацыі „500“ кожную пяцідзёнку паведамляць ЦК ЛКСМБ аб ходзе мобілізацыі „500“, а таксама дасылаць зьвесткі аб мобілізаваных і аб тым, ці прыступілі мобілізаваныя да вучобы.

5. Прапанаваць „Чырвонай Зьмене“ кожную пяцідзёнку даваць зводку аб стане мобілізацыі, жорстка выкрываючы і тых, хто зрывае мобілізацыю „500“, а таксама сачыць, каб мобілізаваныя былі забясьпечаны адпаведнымі ўмовамі ў навучальных установах.

6. Лічыць неабходным, каб Наркомасьветы даў паказаньні ўсім пэдтэхнікам аб прыёме мобілізаваных і аб забясьпечаньні іх стыпэндыяй, інтэрнатам, падручнікамі і інш.

Адкрыўся ўсебеларускі зьлёт польскі[х] колгасаў

Учора адкрыўся ўсебеларус[кі] зьлёт польскіх колгасаў. На зь[лёт] прыбыла 30 дэлегатаў ад са[мых] буйных польскіх колгасаў БСС[Р]. Зьлёт прыняў наступны пара[дак] дню:

1. Становішча і далейшыя мер[а]прыемствы па колектывізацыі по[ль]скіх бядняцка-серадняцкіх гаспа[да]рак у БССР.

2. Аб задачах падрыхтоўкі [да] другой бальшавіцкай вясны.

Па першым пытаньні зьлёт [за]слухаў даклад т. Прынца. Тав. Пр[ынц] адзначыў, у сваім дакладзе, [што] разгортваецца шпаркі рух коле[к]тывізацыі сярод бядняцка-серадня[ц]кіх мас польскай нацыянальнасьці. Два польскіх нацыянальныя са[вє]ты—Любавеньскі, Буда-Кашалёў[с]кага раёну і Александраўскі, Бя[ла]нецкага раёну, колектывізава[ны] амаль цалкам. 10 вёсак інш[ых] польскіх нацыянальных сельса[ве]таў колектывізаваны ад 50 да [...] проц. Наглядаецца значны прыл[ў] польскія нацыянальныя і зьме[шан]ныя колгасы.

У спрэчках выступіла 10 дэ[ле]гатаў, якія падкрэсьлілі тую во[ст]рую клясавую барацьбу, якая за[раз] наглядаецца ў польскай вёсцы [і] адзначалі неабходнасьць узмацне[нь]ня соцыялістычнага спаборніцтва [і] ўдарніцтва ў галіне падрыхтоўкі [да] вясны.

За разбурэньне колгасу кулакі прыгавораны да расстрэлу

Ташкент, 6.—У пасёлку Крэсьцянскае, Міргачульскага павету (Узбэкістан) выяздной сэсіяй Вярхоўнага суда СССР разгледжана справа групы кулакоў, пранікнуўшых у колгас „Красный Восток“ і шкодніцкай работай выклікаўшых яго развал. Кулак Іван Гушын, спэцыяліст—садавод, з шкодніцкімі мэтамі знарок зрабіў пасадку новых дрэваў у колгасе на нягодных засьмечаных землях. Пралезшы на пасаду старшыні колгасу кулак Макарэнка знарок затрымліваў п[а]хлапковых пасеваў у колгасах, ч[то] выклікаў значнае зьніжэньне ў[ра]жайнасьці. Трэці кулак—Сапега натуральна сеяў варожасьць пам[іж] батракамі, беднякамі і серадняка[мі] членамі колгасу. Усе каманд[ныя] пасады ў колгасе былі разьмерк[а]ваны паміж родзічамі гэтай кула[ц]кай групы. Кулакі Гушчын, Ма[ка]рэнка і Сапега прыгавораны [да] расстрэлу.

Больш масавасьці

Комсамольская ячэйка Менскай шчотачнай фабрыкі заданьне па падпісцы на „Чырвоную Зьмену“ выканала поўнасьцю. Але гэта праца, трэба сказаць шла самацёкам. Ніякай масавай працы вакол распаўсюджваньня газэты ня было. Упаўнаважаны комсамольскага колектыву, тав. Багданава, ня ведае нават колькі комсамольцаў і бе[с]партыйнай моладзі выпісваюць г[а]зэту, хто зьяўляецца пэхавым ўпа[ў]наважаным, якая чытаемасьць „Чы[р]вонай Зьмены“.

ПРОЖЭКТАР

Італьянскія рабочыя—ахвяры рабаўласьніцкай буржуазіі

“На шчасьце італьянскі народ яшчэ ня прывык есьці па некалькі раз у дзень. Па колькі ў Італіі ў рабочага скаромны жыцьцёўзровень, ён менш чулы да нястатку і мучэньня“ (Мусоліні, сэнацкая прамова 18—XII-30.).

Італьянская буржуазія, па прыкладу іншых капіталістычных краін, шукае збавеньня ад экономічнага крызісу ў зьніжэньні заработнай платы рабочым. Фашыстыя робяць гэта найбольш адкрыта—„Шляхам загаду“. Мусоліні загадаў 1 сьнежня зьнізіць заработную плату дзяржаўным служачым на 12 проц. Адначасова ён намеціў ўсеагульнае зьніжэньне заработнай платы рабочых.

Адзін з італьянскіх міністраў, Ботлі, з гэтай прычыны выказаў нядаўна ў Мілане „пункт погляду фашыцкага ўраду“.

„Краіна (ці не буржуазія толькі?, ці не прадпрыемцы?) з‘экономіла на скарочаньні зарплаты рабочым і служачым у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы 2 мільярды 600 мільёнаў лір“...

Жабрацкі ўзровень заработнай платы італьянскага рабочага магчыма будзе яшчэ больш зьніжаны. На вуліцах Італіі гэтага някупленага тавару—жывой рабочай сілы, назьбіралася зараз вельмі многа. Сотні беспрацоўных паміраюць з голаду, ня маючы магчымасьці нават за мізэрныя грашы знайсьці работу. У Італіі беспрацоўе агромністае. Па паменшаных лічбах, беспрацоўных ня менш 700 тысяч чал. Становішча рабочае клясы Італіі пасьля нядаўнага скарочаньня заработнай платы і пры агромністым росьце беспрацоўя настолькі пагоршылася, што на справе італьянскія рабочы ў фашысцкай Італіі зьяўляецца белым нявольнікам фашысцкай дзяржавы.

Змагацца за свае правы з дапамогаю профсаюзаў?

Але кіраўнікі профсаюзаў, якія не пажадалі ўзяць на сабе адказнасьці за зьніжэньне заработнай платы, скінуты. На іх месца пасаджэны надзвычайныя камісары.

Мусоліні, аднак, рашыў „дапамагчы“ беспрацоўным сам. Яшчэ 18 жніўня ён дазволіў провінцыйнай ула зе палегчыць выдачу праязных дакумантаў для італьянскіх рабочых, якія жадаюць выехаць у іншыя краіны. Провокацыя прашла з поўным посьпехам. Вялікая хваля, беспрацоўных хлынула з Італіі, аднак большасьць іх, пасьля цяжкіх мучэньняў і вандроўкі вярнулася ў Італію, не знайшоўшы работы з прычыны беспрацоўя, якое лютуе ва ўсім сьвеце. Ня толькі Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, але і Канада, Аўстралія і іншыя краіны забаранілі ўезд італьянскім рабочым.

Ці не таму Мусоліні цяпер з фанабэрыяй заяўляе, што „Італьянскім рабочым ў Італіі жывецца ня горш, чым дзе-небудзь у іншай краіне“...

Глыбокае нездавальненьне фашысцкім рэжымам, якое ўсё больш і больш ахоплівае розныя пласты працоўных італіі, прымусіла нават звыш-буржуазную ангельскую газэту „Таймс“, якая заўжды станоўча адносілася да фашыстых, напісаць ў нумары ад 2 студзеня:

„Ніколі з дня забойства Маттэоты, у краіне ня было столькі нараканьняў. Звонку урад вельмі моцны. Фашысцкая міліцыя—галоўны твар і асноўны хрыбет рэжыму, ніколі ня была такой шматлікай, такой вопытнай і настолькі добра ўзброенай.

Самі фашыстыя вымушаны прызнаць, што пануючы настрой, нават вышэйшых клясаў і асабліва інтэлігенцыі, можа быць азначаны толькі як мяккае цярпеньне.

З кожным днём абвастраюцца ў Італіі клясавыя супярэчнасьці. Фашысцкі рэжым у Італіі трымаецца на чале ўлады толькі дзякуючы ўжываньню грубой сілы і адкрытага тэрору“.

Эміліо Бэрці

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТ[...]

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599